УДК 821.161.3.09-84

# Слова-вобраз у паэзіі Пімена Панчанкі

Гаўрош Н. В., Савіцкая І. У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Творчасць П. Панчанкі ваеннага часу – гэта лірыка суровай праўды, паэзія надзвычай трагедыйнага гучання. Трывожным камертонам гучыць голас роднай Беларусі, зруйнаванай вайною. У адзін сінанімічны рад паэт лагічна ставіць назоўнікі: *Беларусь, радзіма, родны край, краіна, прасветлая любоў, родная зямля,* кожны з якіх аздабляе вобразнымі азначэннямі, агульнамоўнымі, аказіянальнымі і народна-паэтычныымі.

Агульнамоўныя азначэнні-эпітэты – словы з прамым і пераносным значэннем: **гордая, баявая, працавіта** Беларусь, любоў **светлая,** край **распяты**, зямля **вогненная, разгневаная**. Абаронцы міру! Нас мільёны На ўсёй **разгневанай** зямлі (Абаронцы міру). Метафарычныя вобразныя азначэнні фарміруюцца на аснове ўзаемадзеяння асноўнага (прамога) і вытворнага (пераноснага) значэнняў слова: **залатыя** суніцы, **светлы** гай, **блакітныя** снягі, **крывавае** сонца, **дзікія, смяротныя** агні, **бязлітасная** ноч. У гэту **журботную** восень, Здаецца зямля ўся галосіць, І вецер праклёны разносіць, І пушча трывожна гудзе (Адпомсцім!).

*Індывідуальна-аўтарскія* (*аказіянальныя*) азначэнні адрозніваюцца арыгінальнасцю аўтарскага ўжывання і адлюстроўваюць светапогляд пісьменніка. Умова іх узнікнення – нестандартнасць спалучэння з паяснёнымі словамі, якая раскрывае своеасаблівасць аўтарскіх асацыяцый: ***пякучая*** *помста,* ***белая*** *ярасць,* ***сцюдзёныя*** *маланкі,* ***раз'юшаны*** *агонь,* ***бездапаможныя*** *рэкі,* ***расстрэлены*** *лес,* ***мядовыя***, ***лядовыя*** *росы. Вы мне скажаце: будзе ізноў бэз і дзяўчаты ў лёгкіх блакітных сукенках. Для мяне ж яшчэ доўга* ***расстрэлены*** *лес Захліпацца будзе дзіцячым енкам* (Адплывае на захад гарматны гром). Вобразнымі ў радку паэта становяцца і *народна-паэтычныя* азначэнні, якія прыйшлі з фальклорных крыніц. Паэзія П. Панчанкі дала ім новае жыццё: ***чорныя*** *хмары,* ***горкія, сірочыя*** *вочы, слёзы,* ***вечны*** *агонь, грыбны* ***дождж.*** *З гнёздаў мы даўно павылятлі, Ды не развучыліся глядзець, Як па* ***спелым*** *полі, па атаве Дождж* ***грыбны*** *на дыбачках ідзе* (Дождж ідзе праменісты…). *На брацкай магіле – балгарскія ружы.* ***Сірочыя*** *вочы і плачуць і тужаць У трэцяй хаціне* (Песня пра чатыры магілы).

Аўтарскія ацэнкі-характарыстыкі асабліва глыбокія, эмацыянальныя, выражаныя дзеепрыметнікамі і дзеепрыметнымі словазлучэннямі: у такіх азначэннях не толькі называецца якасць прадмета (з'явы), а і перадаецца дынаміка аўтарскіх ацэнак-характарыстык.